***Кардаш А. Б.**, настаўнік пачатковых класаў сярэдняй школы № 17 г. Ліды Гродзенскай вобласці*

# Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

## Беларуская мова. II клас

***Мэта:*** фарміраваць паняцце цвёрдыя і мяккія зычныя гукі, фарміраваць уменне адрозніваць цвёрдыя і мяккія зычныя ў словах і абазначаць іх на пісьме.

***Задачы:***

- выпрацоўваць уменне рабіць гукавы аналіз слоў;
- пашыраць лексічны запас вучняў;
- выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Беларсукая мова» для 2 класа (Свірыдзенка В. І., 2020).

**I. Арганізацыйны этап.**

— Усім добры дзень
І ў добры час.
Мова родная ў нас.
На ўрок вас запрашаю,
Усім поспехаў жадаю.

**II. Праверка дамашняга задання.**

— Якое заданне выконвалі дома? Што трэба было зрабіць?

— Прачытайце загадку. Назавіце слова-адгадку. *(Снягір.)*

— Якую літару ўставілі ў слове *галінкі*? Растлумачце. А ў слове *сняжок*? У слове *сцяжок*?

— Я бачу, што вы любіце адгадваць загадкі. Таму я падрыхтавала для вас яшчэ адну.

Плаваю пад мастком,

Віляю хвастком,

Па зямлі не хаджу,

Рот ёсць, ды не кажу.

— Хто гэта? *(Рыба.)* ***(Слайд 2.)*** Загадка спадабалася і залатой рыбцы, таму яна з'явілася на экране. Запрашае на рыбалку, але не на сапраўдную, а на чароўную. Замест рыбы будзем лавіць новыя веды, новыя ўражанні, добры настрой.

— Як называецца чалавек, які любіць парыбачыць? *(Рыбак.)* ***(Слайд 3.)***

**III. Этап актуалізацыі ведаў.**

— Дарэчы, колькі галосных і зычных у слове *рыбак*? Хлопчыкі будуць лічыць галосныя гукі, а дзяўчынкі зычныя.

— Колькі галосных гукаў? Назавіце іх. ***(Слайд 3.)*** Колькі зычных гукаў? Назавіце іх.

— Як у сапраўдных рыбакоў, у вас на партах ёсць пасведчанне рыбака (спецыяльны дакумент). У ім на сённяшнім уроку будзем абазначаць усе вынікі нашай працы. Заштрыхуйце квадрацік пад нумарам 1 патрэбным колерам: зялёным — калі правільна палічыў зычныя і галосныя гукі, жоўтым — сумняваўся, чырвоным — няправільна.

**IV. Чыстапісанне.**

— Так як мы з вамі ў ролі рыбакоў, то і на чыстапісанне да нас завітае літара ***Р***. Але спачатку трэба адказаць, на што падобная маленькая літара ***р***? ***(Слайд 4.)*** *(На вуду.)* Вуда нам на рыбалцы вельмі спатрэбіцца, таму, я спадзяюся, вы будзеце старацца прыгожа напісаць літару ***р***. На другім радку запішам склады з літарай ***р***. (Чытаем разам.)

*Рр Рр Рр Рр Рр*

*ра ро ру ры рэ*

— Ацаніце сваю стараннасць у пасведчанні. Заштрыхуйце квадрацік з нумарам 2 неабходным колерам: зялёны — стараўся, усё атрымалася, жоўты — стараўся, але не ўсё атрымалася, чырвоны — зусім не стараўся.

**V. Арфаграфічная размінка.**

— Пакуль вы пісалі, на дошцы з'явілася цікавае заданне ад залатой рыбкі.

Пайшоў в..сёлы [с'ома] л..віць р..чнога [сома].

— Паспрабуйце прачытаць гэты сказ самастойна.

— А цяпер дапамажыце і мне яго прачытаць. Спачатку ўставім літары, якія змыла вадой.

Вучні паказваюць прапушчаныя літары на картках. Тлумачаць.

— Што гэта за словы, зашыфраваныя ў квадратных дужках? Вы не ведаеце? (Словы запісаны ў транскрыпцыі.) Гэта значыць, што трэба звяртаць увагу на ўсе значкі.

— Што абазначае маленькая косачка каля літары ***с***? *(Тое, што зычны трэба вымаўляць мякка.)*

— Чытаем першае слова. Другое. Словы прачыталі, але пра што гэты сказ, я пакуль не зразумела. Давайце ўвесь сказ прачытаем разам.

— Ці зразумелі, хто такі Сёма? *(Хлопчык.)*

— А хто такі сом? *(Рыба.)* ***(Слайд 5.)***

— Якім гукам адрозніваюцца гэтыя словы? *(*[с] [с'].*)*

**VI. Пастаноўка мэты.**

— І тэма нашага ўрока гучыць так: «Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме» (***слайд 6***). Значыць, на ўроку мы будзем вучыцца адрозніваць якія гукі? *(Цвёрдыя і мяккія.)* А таксама будзем вучыцца правільна абазначаць іх на пісьме.

**VII. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

— Але давайце вернемся да зашыфраваных слоў. Як жа іх запісаць з дапамогай літар?

Настаўнік піша слова *сома*, а дзеці ацэньваюць правільнасць, пасля піша слова *Сёма* з памылкамі. Дзеці выпраўляюць.

— Чаму трэба пісаць з вялікай літары? *(Таму што гэта імя хлопчыка.)*

— Чаму нельга напісаць з літарай ***о***? *(Таму што гук* [с’] *гучыць мякка, а мяккасць папярэдняга гука абазначае літара **ё**, а не **о**.)*

— Толькі літара ***ё*** выконвае ў слове такую працу? *(Не.)*

**Праца ў групах.**

— Давайце аб’яднаемся ў групы і правядзём даследванне, паназіраем за словамі *зіма, люстэрка, лес, сябры, конь.*

— Будзем шукаць літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі, і асаблівую ўвагу звяртаць на літары, якія стаяць пасля іх. (Настаўнік паказвае на прыкладзе. Назіраем за словам *нёс*.)

Пасля таго як групы падрыхтаваліся, адказваюць лідары груп.

— Якую літару выбралі ў слове? *(Слова зіма. Мы выбралі літару **і**.)*

— Дакажыце, што яна абазначае мяккасць. *(Гук* [з’] *у слове зіма вымаўляецца мякка, літара **і** стаіць пасля яго, значыць паказвае мяккасць.)*

Такім чынам вылучаем і астатнія літары, якія абазначаюць мяккасць папярэдняга зычнага. Лідары груп падыходзяць да дошкі і пераносяць рыбак з гэтымі літарамі з сіняга вадаёма ў зялёны.

— Ацаніце сваю працу ў групе. Заштрыхуйце ў пасведчанні квадрат з нумарам 3.

— Давайце зробім вывад, гледзячы на рыбак, якіх вы перамясцілі ў зялёны вадаём. *(Літары **е, ё, і, ю, я, ь** абазначаюць мяккасць папярэдніх зычных гукаў.)*

— Літары, якія засталіся ў сінім вадаёме, можа, зусім нам непатрэбныя? Што яны абазначаюць? *(Цвёрдасць папярэдняга зычнага.)*

— Прывядзіце прыклады такіх слоў.

— Давайце звернемся да падручніка і праверым, так гэта ці не.

***Праца з падручнікам.***

Настаўнік чытае правіла, дзеці сочаць. Пасля чытаюць самастойна. Расказваюць адзін аднаму ў пары.

— Памяняйцеся пасведчаннямі і ацаніце веды свайго сябра.

***Фізкультхвілінка.***

***Слайд 7.***

На рыбалку мы ідзём,
Вуду мы з сабой нясём.
Добра з лепшымі сябрамі,
Сонейка ідзе за намі.
Мы прыселі, пасядзелі
І шпарчэй далей пайшлі.
Радасць, добрае надвор'е
На рыбалцы мы знайшлі.

**VIII. Замацаванне.**

С. 5, практ. 4.

— Прачытайце заданне. *(Трэба знайсці назвы рыб у радзе літар.)*

шчупакарплоткакунёкарась

— Давайце размяркуем гэтыя назвы ў два слупкі. У першым будуць словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя. У другім — словы з мяккімі зычнымі. Напрыклад, першае слова *шчупак* у які слупок змесцім? *(У першы.)*

— Дакажыце.

— Знайдзіце слова, якое можна будзе змясціць ў другі слупок. Дакажыце.

— Астатнія словы размяркуйце самастойна.

— Правяраем па ключу. ***(Слайд 8.)***

— Заштрыхуйце квадрацік з лічбай 5 у пасведчанні адпаведным колерам.

***Фізхвілінка для пальчыкаў.***

Рыбкі плавалі, ныралі ў цёплай сонечнай вадзе.

То сажмуцца, разажмуцца,

То зарыюцца ў пяску.

**IX. Этап абагульнення і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу.**

— Залатая рыбка падрыхтавала для вас яшчэ адно цікавае заданне.

— Колькі сказаў у мяне на дошцы? *(Два.)* (Пайшоў, рэчку, на, хлопчык. Ляшча, злавіў, Міхась.) Але словы пераблыталіся. Чытаем першы сказ. Выпраўляем. Чытаем другі сказ. Выпраўляем. Трэба запісаць сказ, у якім у кожным слове ёсць мяккія зычныя гукі. *(Міхась злавіў ляшча.)*

— Якія літары вам падказалі, што ў гэтых словах ёсць мяккія зычныя гукі?

— Адзначце вынік сваёй працы ў пасведчанні.

**X. Этап падвядзення вынікаў. Рэфлексія.**

— Залатая рыбка вамі вельмі задаволена, але хоча праверыць, як вы засвоілі тэму ўрока. Вазьміце аркуш з лічбамі і аранжавы аловак. ***(Слайд 9.)*** Слухайце ўважліва пытанне. (Пяць пытанняў. Вучні заштрыхоўваюць пэўныя часткі на малюнку.)

— Пакажыце малюнкі сваім сябрам. Прымацуйце рыбак на хвалі, якія вы бачыце на дошцы. Гэтыя прыгожыя рыбкі гавораць мне пра тое, што вы добра засвоілі тэму ўрока.

— Якія зычныя мы вучыліся адрозніваць на ўроку? *(Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі.)* Якія літары абазначаюць мяккасць папярэдняга зычнага? Якія літары абазначаюць цвёрдасць папярэдняга зычнага?

**XI. Дамашняе заданне.**

***Слайд 10.***

С. 3, правіла, с. 6, прак. 7.

— Залатая рыбка ўжо паплыла ў другі клас, а для вас пакінула маленькія падарункі. Знайдзіце іх пад сваімі стульчыкамі.

— Што напісана на кароне? *(Малайчына!)*

— Я таксама задаволена вашай працай. Урок закончаны.